ЖАНЧЫНА… АЙЧЫНА… СУСВЕТ…
Вершы берускіх паэтаў
Укладанне Віктара Шніпа

У збонік, прысвечаны Году беларускай жанчыны, увайшлі вершаваныя творы, прысвечаныя лепшай палове чалавецтва: жанчыне-маці, жанчыне-працаўніцы, жанчыне-абаронцы Айчыны, жанчыне-прыгажуні. На прыкладзе вершаў, напісаных у розныя часы нашымі вядомымі паэтамі, паказваецца лёс жанчыны ў далёкім мінулым і ў сённяшні дзень.

Кнігу ўпрыгожваюць рэпрадукцыі карцін айчынных мастакоў, прысвечаныя вобразу жанчыны.

Пяць вершаў з кнігі

МАКСІМ ТАНК
(1912—1995)

Ave Maria

Звон кафедральны кліча на Ave.
З цесных завулкаў злева і справа
Гуртам манашкі ў чорным адзенні
Цягнуцца, быццам сумныя цені.
Тут і старыя, і маладыя, –
Ave Maria...

Я не звярнуў бы і ўвагі можа,
Ка не пабачыў між іх прыгожай
Стройнай манашкі, якая мае
Не больш, хіба, як семнаццаць маяў;
Чорныя вочы, бровы густыя, –
Ave Maria!

Нат пад жалобнай вопраткай чорнай
Ты адгадаеш: стан непакорны,
Ножкі, якімі б на карнавалах
І захапляла і чаравала,
Смуглыя рукі, грудзі тугія, –
Ave Maria!

Глядзіць набожна на крыж пятровы,
А я малюся на яе бровы:
Няўжо, красуня, ты не шкадуеш,
Што харство і жыццё марнуеш?
Як танцавалі б ножкі такія, –
Ave Maria!

Цябе атрутаю апаілі,

Ружанцам рукі табе скруцілі.
Смялей парві ты яго, не бойся!
У полі недзе шуміць калоссе…
О, як бы жалі рукі такія, –
Ave Maria!

А потым хутка прыйшло б каханне,
Страчала б з мілым свой золак ранні.
А потым стала б ты гаспадыняй
І калыхала б сваю дзяціну!
О, як кармілі б грудзі такія, –
Ave Maria!

Не знаю, можа, мая малітва
Выйграць бы мне памагла гэту бітву,
Але пазвалі яе; манашка
Пайшла за ўсімі, ўздыхнуўшы цяжка,
Пад звоны змрочныя і глухія, –
Ave Maria!

АЛЯКСЕЙ ПЫСІН
(1920—1981)

* * *

Перад фатографам жанчына
Хавае рукі пад фартук,
Нібы ёсць нейкая прычына
Сароміцца ўласных рук.

Фатограф і суседкі раяць:
— Без фартука лепш зняць бы Вас...
Але не ведае старая,
Што ў рукі ўзяць на гэты час.

Палола лён... Снапы вязала...
Дзяцей люляла па начах...
Часіны ж гэткае не знала,
Каб не трымаць чаго ў руках.

УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ
(1930—1984)

Ты і я

Ты і я: пралеска ў снах бурану,
Дрэўца вішні ў ярасным агні,
Кропля на спіне Левіафана,
Радуга на крылах навальніц.

Пад дзевятым валам ветразь ніцы,
Верас, што агнём абняў пярун,
Павуцінка ў пекле навальніцы, –
Адкажы на вуха ўладару,

Як мне здужаць ураган і вецер,
Вечны мой, зацяты, страшны бой?
Як мне, моцнаму, пражыць на свеце
Без цябе, танюткай і слабой?

ВЕРА ВЯРБА
(1942—2012)

* * *

Усё ў жыцці здаецца проста,
На ўсё вы знойдзеце прычыны.
Як гэта цяжка быць дарослай,
Як гэта цяжка быць жанчынай.

Насустрач плёткам і абразам
Пранесці горда твар прыгожы,
Затое быць з каханым разам,
І ў гэтым толькі шчасце, можа.

А потым старасць, потым восень,
Хаваеш першыя маршчыны.
Хоць уваччу ўсё тая ж просінь,
Ды сэрца ные без прычыны.

Дачка сама адрэжа косы,
І рассказаць ёй немагчыма,
Як будзе цяжка жыць даруслай,
І ў колькі раз цяжэй — жанчынай.

АЛЕГ САЛТУК
(1946—2015)

* * *

Стаіць і смяецца жанчына.
Расчынена насцеж акно.
І шчасце маё так магчыма,
Бо так недалёка яно.

Смяюцца і вусны, і вочы,
І нават вяснушкі яе.
І многім той воблік жаночы
Спакою нідзе не дае.

Я з ёю бязмежна шчаслівы.
Як казачны церам, пакой.
Праменьчык, такі ўжо ліслівы,
Зырчыць над жаночай шчакой.